**Работнікі навукі і вышэйшых навучальных устаноў! Змагайцеся за далейшы росквіт навукі, за тэхнічны прагрэс! Рыхтуйце спецыялістаў, дастойных эпохі камунізма!**

**Слава передавой савецкай навуцы!**

*(З Заклікаў ЦК КПСС да 46-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі).*


Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя У. І. ЛЕНІНА

№ 30 (539) Субота, 19 кастрычніка 1963 г. Цана 1 кап. Год выдання XVI-ы


**Дыскусійны клуб Мінскага гарадскога аддзялення таварыства „Веды" і камітэта камсамола Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна**

**„Ведаць, шукаць, змагацца"**

**запрашае на дыспут**

**«ЯК ТЫ ЎЯЎЛЯЕШ САБЕ ЧАЛАВЕКА БУДУЧЫНІ?»**

1. У чым мэта і сэнс нашага жыцця?
2. У чым вы бачыце ўжо сёння рысы камунізма?
3. Ці гатовы вы жыць пры камунізме і кіраваць яго справамі?
4. Як вы ўяўляеце сабе ўсебакова развітую асобу пры камунізме?
5. Як жыць і працаваць, каб духоўная прыгажосць чалавека праявілася паўней і ярчэй?
6. Якія маральныя якасці больш за ўсе неабходны будаўнікам камунізма?
7. Як стаць сёння ўровень з эпохай?
8. Ці трэба марыць аб будучыні?
9. У чым прыгажосць і высакароднасць чалавека?
10. Чаму мы сурова асуджаем эгаістаў, дармаедаў, скнараў, стыляг, бюракратаў як апошняе пристанішча чужой нам ідэалогіі і маралі?

**Дарагія таварышы!** Падумайце над гэтымі пытаннямі і прыходзьце на вечар-дыспут. Вы можаце паставіць на абмеркаванне ўсе пытанні, што вас цікавяць. Важна, каб яны дапаглі выявіць сутнасць тэмы і выклікалі агульную цікавасць.

Дыспут адбудзецца 25 кастрычніка ў актавай зале корпуса па вуліцы Чырвонаармейскай, 6. Аб часе пачатку дыспута будзе аб'яўлена ў афішах.

## *Чатырнаццаць дружных*

Не па-асенняму горача пячэ сонца, жартуючы з залацістым лісцем дрэў, адлюстроўваючыся ў вокнах дамоў прыціхшай вёскі.

Цішыня... Толькі маленькія запэцканыя хлапчукі капаюцца ў пяску, ды дзе-нідзе сядзяць, грэюцца на сонцы сівыя дзяды. Затое далёка за вёскай, у полі, мільгаюць белыя, жоўтыя, чырвоныя хусцінкі жанчын, цёмныя картузы мужчын, тарахцяць трактары, ездзяць туды-сюды шматлікія фурманкі — ідзе ўборка бульбы. Як раз у такі час ліха падкаціла да калгаснага двара Міханавіч (так называецца гэтая вёска) запыленная аўтамашына з такімі ж запыленнымі дзяўчатамі..

«Здравствуй, милая картошка-тошка-тошка», — раздаюцца па вёсцы вясёлыя галасы дзяўчат. «Дзяўчаты, прыехалі, злязай!» — крычыць самая маленькая і худзенькая наша аднакурсніца. На зямлю паляцелі рукзакі, сумкі. Песні, жарты, бязвоблачны радасны настрой, выбухі безупыннага смеху, б'ючая цераз край жыццёрадаснасць, маладосць разбудзілі прыціхшую вёску.

Гэта мы, чатырнаццаць дзяўчын — студэнтак першага курса біялагічнага факультэта БДУ імя У. І. Леніна, адзін з атрадаў вялікай арміі студэнтаў, што прыехалі дапамагчы калгасам Міншчыны ўбраць ураджай бульбы.

Знаёмства з брыгадзірам і брыгадай, размеркаванне па кватэрах, атрыманне прадуктаў — вось так і прайшоў наш першы дзень на бульбе.

Наступнай раніцай, а васьмой гадзіне, мы ўжо сядзелі, нахохліўшыся, на фурманках, поўныя рашучасці актыўна ўключыцца ў барацьбу за ўраджай.

І замільгалі дні... Хутка ляцяць час за працай. Па-летняму сонечныя дні з немагчымым пылам змяніліся халоднымі, з бясконцым, надакучыўшым, дробным дажджом. Моцна здружыліся мы за гэтыя дні паміж сабой, пасябравалі і з калгаснікамі.

Многаму навучыліся за гэтыя дні. Смешна было глядзець, калі ўпершыню фурманамі былі дзяўчынкі, якія раней не мелі нават уяўлення аб гэтым відзе транспарту. Стараліся крычаць на коней, як мужчыны-калгаснікі, баяліся ўдарыць пугай. Часцей за ўсё ледзь не прасілі: «Ну, ідзі ж! Конь ты, у рэшце рэшт, ці не!».

Затое праз некаторы час многія з нас ліха правілі фурманкамі. А Надзюша Самахвалава нават навучылася ездзіць вярхом. З гонарам праязджала міма нас, крочыўшых на поле пешшу, пакуль у адзін цудоўны дзень мы не ўбачылі яе побач з намі «абяззброенную». Стары конюх проста пабаяўся за коней: яны чамусьці пачалі больш прывязвацца да Надзі, чым да яго. З лёгкай рукі нашага студэнцкага брыгадзіра Светы Куцік фурманку перахрысцілі ў «карэту».

Асабліва весела было на полі ў цёплыя дні «бабінага лета». У кароткія перапынкі мы бегалі ў лес збіраць грыбы, любаваліся стройнымі бярозкамі, зялёнымі хвоямі, магутнымі беларускімі дубамі. Увечары, калі ішлі з работы, мы заціхалі перад прыгажосцю нашай роднай прыроды.

Вялізнае чырвонае сонца нeяк урачыста хаваецца за ўзгорак. Яно змарылася, як і мы. Але радасна ад усведамлення важнасці сваёй працы. Звычайна ў такі час сціхалі смех і жарты, узнікалі ціхія, задушэўныя песні. Часта пачыналі чытаць вершы. Ясенін, Блок, Пушкін, Някрасаў, Раждзественскі, але часцей —Маякоўскі. Было проста здорава глядзець на вялізны чырвоны шар і прасіць сонца «светить всегда, светить везде, до дней последних донца, светить — и никаких гвоздей!...».

У дрэннае надвор'е цяжка было трымацца, выконваць сваю норму, паспяваць за калгаснікамі. Мерзлі рукі, працавалі моўчкі. Асабліва раніцай.

Вось тут па-сапраўднаму і раскрыўся характар кожнай з нас. Сярод нас не аказалася ні дэзерціраў, ні ныцікаў. Весела праваджалі ў Мінск Люсю Сціпанаву, што выступала ў канцэрце, хваляваліся за Лосеву, раптам захварэўшую. Цэлых тры тыдні жылі мы і працавалі ў калгасе.

Як прыемна было чуць ад калгаснікаў словы ўдзячнасці за дапамогу! Уязджалі мы з радасным настроем ад таго, што мы аказалі вялікую дапамогу ва ўборцы бульбы, і ад таго, што нас зноў чакалі кнігі, сшыткі — вучоба.

Гэтыя дні здружылі нас, дапамаглі крыху паспрабаваць нашы сілы ў працы калгасніка, многаму навучылі і ў многім дапамаглі.

**Жанна ЛЯХАВА,**
**студэнтка 1 курса біяфака.**

### У ПАРТЫЙНЫМ КАМІТЭЦЕ УНІВЕРСІТЭТА

**Днямі ў партыйным камітэце разгледжана пытанне аб падрыхтоўцы да святкавання 46-й гадавіны Вялікага Кастрычніка. З мэтай правядзення падрыхтоўчых і арганізацыйных мерапрыемстваў на ўсіх факультэтах створана спецыяльная камісія ў наступным складзе:**

**Кірсанаў А. В.—старшыня камісіі.**

**Гусеў А. Д. — намеснік старшыні камісіі.**

**Члены камісіі:**

**Малышаў А. Я., Рылюк Г. Я., Макарэвіч В. С., Царук А. В., Кіслякоў С. А., Гахаў Ф. Д., Бекешка С. П., Цікавы В. Ф., Пікулеў А. Т., Мажэйка Н. С., Ламавой В. Н., Протчанка В. У., Мельцар Б. А., Лаўруковіч У. І., Шапялевіч В. П.**

**Камісія ўжо прыступіла да работы. Яна клапоціцца аб святочным афармленні універсітэцкіх будынкаў, аб правядзенні ўрачыстых сходаў і пасядженняў, аб афармленні святочных калон дэманстрантаў.**

## СВЕТКА

Як жа так атрымалася, Светка? Сташ ты, нізка апусціўшы галаву, і слухаеш словы дакору ад таварышаў. Не спыталася дазволу ні ў старшага групы, ні ў камсорга, не параілася ні з кім і паехала ў Мінск, Крыўдна мне за цябе. Крыўдна за тое, што ты неяк адбілася ад калектыву, жывеш сама па сабе. Ды вось яшчэ і дысцыпліну парушыла. А ты ж такая харошая дзяўчына, Светка...

— Прашу слова, — сказала ты нясмела як раз у той час, калі ў хаце на нейкі момант наступіла цішыня.

Позіркі ўсіх скрыжаваліся на тваім твары. Дваццаць пяць пар вачэй глядзяць на цябе. Дваццаць пяць сяброў — камсамольцаў чакаюць твайго слова. А ты сказала зусім мала:

— Я выпраўлю сваю памылку...

Ну, што ж, дакажы. Ты ведаеш, як усе мы шчыра жадаем перакanaцца ў гэтым. А я, пэўна, больш за ўсіх. Ты ж такая харошая дзяўчына, Светка...

Наступіў ранак. А на вуліцы неяк цёмна. Над вёскай высока плывуць хмары. Вецер злуе не на жарт, кідаецца жоўтым лісцем. Дождж ідзе несупынна. Восень, відаць, рашыла ўзяцца за работу па-сапраўднаму.

Сёння не пойдзем капаць бульбу. Аб гэтым сказаў нам сам брыгадзір чацвёртай паляводчай брыгады калгаса «Бальшавік» Іосіф Андрэевіч Баркоў.

У хаце як ніколі цёпла, утульна. У такую непагадзь не тое што ў хаце, а нават пад любым дахам адчуваеш сябе, як у царскім палацы.

Прыкладна ў дзве гадзіны дня хтосьці падыйшоў да акна і раптам крыкнуў:

— Хлопцы, паглядзіце!

Мы кінуліся туды. Ішоў дождж, бушаваў вецер, пранізваў холад, а ў полі працавала дзяўчына. Яна капала бульбу. Гэта была наша Светка Жураўлёва.

Нам стала неяк не па сабе. Мы ж цябе не адпраўлялі туды, Света. А ты ішла дамоў вясёлая, бадзёрая, нібы скінуўшы з душы нейкі цяжкі груз. Ты ішла па вуліцы, а вецер кідаў табе ў твар халодныя кроплі, блытаў твае шаўкавістыя мокрыя косы. Ты ішла і весела спявала песню пра юнага барабаншчыка.

Я выпадкова падслухаў тваю песню, калі ты ўжо ўваходзіла ў пакой. Падслухаў і падумаў: якая шчырая, цудоўная душа ў гэтай дзяўчыны! Інакш яна не змагла б так спяваць...

**Андрэй ЮДЧЫЦ,**
**студэнт І курса філфака.**

## Спорт

* * *

**Днямі ў Мінску закончылася рэспубліканскае першынство фехтавальшчыкаў «Буравесніка». У ім удзельнічалі прадстаўнікі 13 вышэйшых навучальных устаноў. Паспяхова выступілі некаторыя студэнты нашага універсітэта.**

**На шаблях лепш за ўсіх фехтаваў студэнт БДУ Л. Рабчыкаў. Ён не пацярпеў ніводнага паражэння і заняў першае месца.**

**Выхаванец майстра спорту В. Фартунатава майстар спорту М. Ліўшыц выйшаў пераможцам у юнацкіх спаборніцтвах рапірыстаў.**

* * *

**Цэлы тыдзень праходзіла першынство Мінска па баскетболу сярод каманд юнакоў 1946—47 гг. нараджэння. Каманда юнакоў нашага універсітэта заняла 5-е месца з сямі, прапусціўшы наперад калектывы «Дынама», «Спартака», «Трактара» і ДСШ.**

## *Заўтра—крос!*

Заўтра, у 11 гадзін у парку «Перамога» адбудзецца агульнауніверсітэцкі лёгкаатлетычны крос, прысвечаны XIII з'езду савецкіх прафсаюзаў.

Дыстанцыі кросу:

для жанчын — 500 метраў,

для мужчын — 1000 метраў.

## *Усе — на крос!*

**Пад вострым вуглом**

**«Ліфт не працуе»**

**Гэтая шыльдачка даўно ўжо надакучыла кожнаму, хто займаецца ці працуе ў галоўным корпусе. Трэба ўдакладніць — не адзін, а абодва ліфты не працуюць. Адзін увесь час, а другі нават тады, калі працуе, не можа задаволіць студэнтаў і супрацоўнікаў.**

**Трэба спытаць гаспадарчых работнікаў, калі, нарэшце, да людзей пажылых, хворых, якім проста неабходны ліфт, будзе праяўляцца належная ўвага?**

**В. Налімаў.**

# Літаратурная старонка

## Искренность

* * *

Край родной —
Беларусь —
Всегда вспоминаю,
Где бы ни был —
Мне часто
Снится
Песня иволг
Над тихим,
Дремучим гаем,
Вереса,
Аромат суницы...

* * *

Как-то вдруг
Моряки замолчали,
Стал суровее
Каждого взгляд:
Восьмилетняя
Девочка Галя
Пела
«Бухенвальдский набат»...
Сжались
Под робой матросской
Сердца.
Их песня
Рвала
И хлестала.
— Хватит, Галинка!
Не пой до конца!.. —
Крикнул вдруг
Кто-то из зала...
Но девочка пела.
Голос дрожал:
На платьице
Слёзы упали.
Каждый матрос
В это время
Молчал.
Молча
Все клятву давали...
Я верю,
Что думал
Каждый из нас:
Буду крепче
Сжимать автомат,
Чтоб не падали
Слёзы
Из Галиных глаз,
Не стонал
Бухенвальдский набат...

* * *

Распустив
Каштановые косы
И волнуя
Взгляд горящий наш,
Вечером,
В кругу
Друзей-матросов
Танцевала
Девушка
Чардаш...
Изгибаясь,
Била каблучками,
Вся искрилась
В отблесках огня,
Взглядами,
Ресницами,
Губами
Увлекала в сказку нас,
Маня...
Видел я
Прекрасного немало,
Но забыть,
Наверно, не смогу,
Как чардаш
Девчонка танцевала
В нашем флотском,
Дружеском кругу...

* * *

Мне всегда
Навевают грусть
Вокзалы
И поезда...
Сколько судеб
Увозят они!
Вот и нас
Развели
Навсегда...
Под дождём
Шелковистым
Не стой,
Повернись и уйди.
И забудь.
Пусть счастье
Будет с тобой.
А я...
Проживу как-нибудь.
Врезается в ночь,
Гудит
И гудит,
И грустит
Двухрельсовый
Длинный
Путь...

> Вот что Андрей Юдчиц, автор этих стихов, рассказывает сам о себе: «Родился 22 июня 1941 года в Бресте. После средней школы два года работал: в колхозе, литсотрудником районной редакции, секретарём райкома комсомола. Отслужил на флоте. Сейчас — студент первого курса отделения русского языка и литературы. Печатался в районной, областной, республиканской, а также во флотской печати».

* * *

Песней соловьиной,
Голубым туманом,
Облаками белыми
Детство уплыло...
На траву упала
Винтовка деревянная
И листвой кленовой
Под осень замело...
Очень мне хотелось
Вырасти быстрей,
Обойти всю землю —
Глобус небольшой...
А теперь бы — в сказку
Пионерских дней,
А теперь бы — в детство,
Умытое росой...

* * *

Всё,
Что в сердце
Когда-то металось,
Что меня
Волновало до слёз —
Навсегда,
Безвозвратно осталось
В тихом крае
Прибужских берёз...
Вот и липа
Стоит под окном.
Здравствуй, милая!
Здравствуй...
Узнала?
Словно в детстве,
Давным-давно,
Ты меня
На верхушку позвала...
Глянул вниз.
Покраснел.
Застеснялся.
Как же так
Я забрался наверх?
Мне давно уж
Не десять,
А двадцать,
Я ведь взрослый уже
Человек...
Очень часто
Мы тушим
В сердцах
Огонёк,
Что так ласково
Светит.
Радость
Вдруг заблестит
На глазах —
И боимся,
Что люди
Заметят...

* * *

По росе,
Через луг,
Напрямик
Шёл я в утреннем
Синем тумане.
Вот и лес.
Он о чем-то шумит,
Старый лес,
Старый друг мой
Желанный...
Из тумана,
Из синих ветвей
Солнце
Выплыло вдруг,
Улыбнулось...
Жаль мне стало
Всех спящих людей—
С ними
Чудо
Сейчас
Разминулось...

Андрей ЮДЧИЦ.

## Познакомьтесь со стихами Галины Карповой

Биография Галины Карповой небогата: училась, работала шлифовщицей, снова стала учиться— на этот раз в университете. Летом вместе со своими однокурсниками выезжала на целинные стройки. Теперь Галина учится на 3 курсе отделения русского языка и литературы. Печаталась в «Знамени юности», читала свои стихи по радио и телевидению. Пять стихотворений её, разных по форме и теме, мы предлагаем прочитать нашему читателю.

### СЧАСТЬЕ

**Люблю я кручи и подъёмы,
Люблю преграды на пути
За то, что, миновав с трудом их,
Мне легче во сто раз идти.**

**Люблю гудящую усталость
В руках нагруженных, спине,
За то, что каждый отдых стал мне
Приятней и нужней вдвойне.**

**Люблю мороз остервенелый,
Лицо калящий до бела,
За то, что чувствуешь острее
Всю прелесть вешнего тепла.**

**И так всегда: то шторм, то ясно.
Но встану, если упаду.
Я знаю—будет в жизни счастье.
Его ищу, к нему иду!**

* * *

Говорят, что разлука лечит,
Что любую любовь сотрёт,
А душа, чтоб ей стало легче,
Скоро нового изберёт. —

Это глупо, это неверно,
Это просто внушений бред...
Представляешь, как это скверно,
Что тебя в моей жизни нет!

И другому не буду я рада —
Понимаю я это давно.
Видно, сердце другое надо,
Чтоб другого любило оно.

### На первые собственные

**Вечер.
С работы иду.
В рукавичке — деньги.
Собственные,
По труду,
Шелестят и звенькают.**

**Рада первой зарплате.
Спешу в промтоварный.
И покупаю платье —
Пусть не шикарное!**

**Платье за первые деньги,
Свои, на заводе!
Лучшее в жизни и, верю,
Всегда оно будет в моде.**

* * *

Солнце за лето устало, остыло,
Видно, земле всё тепло подарило.
Листья повисли, в багрянце красивы...
Что же трепещет трусиха-осина?
Словно бы ветер беспомощно просит
С веток помочь ей красу эту сбросить.
Весело под ноги ветер швыряет
Лист, что, опившись лучей, умирает.
То, что прекрасно, но мертво и тлеет,
Грусть навевает. Но кто пожалеет?!
...Жажду увидеть весенний поток,
Жизнью наполненный юный росток!..

* * *

**Аэропорт.
Лбом земля прикасается к небу.
Небо хватает частицы земли и уносит.
Ты упорно
Стоял, недвижим и нем.
За тебя говорила серостью, хмуростью осень.
Ветер неистовый мысли даже рвал и одежду,
Тучи взъерошив, гнал, очумелые, вдаль.
И укреплялась молчаньем друг в друга надежда.
Нёс самолёт со мною твою печаль.
В звёзды влюблённый, смотрел на тучи в упор
Грустный аэропорт.**

## Осень

По тропкам у реки неслышно бродит осень,
Сорвёт листок, закружит неспеша.
Вода синей, и ярче в рощах просинь.
Звенит ручей чуть-чуть у камыша.
И в этом тоне светло-грустноватом,
Я знаю, осень, синим ярким днём
В лесном дыму багряно-красноватом
Ты догоришь берёзовым огнём.
Пока ручьи звенят и в древних шатах
Лесов листы старинный вальс поют,
В огне берёз, в уборе их богатом,
У синих рек подстерегу мечту.

Мария ГРУША,
студентка 2 курса филфака.

## По городам страны



Проставьте названия 6 городов, и в выделенных клетках прочитайте название одного из любимых наших городов.

Рэдактар У. КУЛАЖАНКА
Адрас рэдакцыі:
Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, 212. Тэл. 2-07-19.
Друкарня Белсаўпрофа.
АТ 10521. Тыр. 2000. Зак. 3739.